# ГУЛЬНЯВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ ЯК СПОСАБ ДАЛУЧЭННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ДА ЧЫТАННЯ

Шульган Вікторыя Сяргееўна
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Праблема далучэння да чытання з'яўляецца адной з актуальных праблем сучаснай пачатковай школы.

Часта мы чуем «Кніга – гэта адкрыццё свету». Чытаючы, дзіця знаёміцца з навакольным жыццём, прыродай, працай людзей, з аднагодкамі, іх радасцямі, а часта і няўдачамі. Мастацкае слова ўздзейнічае не толькі на свядомасць, але і на пачуцці і ўчынкі дзіцяці. Важна навучыць малодшага школьніка бачыць праяўленне маральных якасцяў у жыцці, адрозніваць дабро і зло, спагадлівасць і раўнадушша, справядлівасць і несправядлівасць, сапраўдную і лжывую дапамогу сябру. Чытаючы літаратурныя творы, вучні засвойваюць паняцці пра дабро, добразычлівасць, спагадлівасць, справядлівасць, вучацца іх адрозніваць. Чытанне – неад'емны элемент культуры грамадства, сродак выхавання, адукацыі і развіцця асобы. Яно развівае інтэлект, дае новыя веды, выпрацоўвае звычку да пазнання, фарміруе ўседлівасць. Зварот да кнігі адыгрывае важную ролю ў псіхафізіялагічным развіцці вучняў: развіваецца фанематычны слых, памяць, увага, уяўленне. Дадзеныя навуковых даследаванняў сведчаць пра тое, што адносіны чалавека да кнігі фарміруюцца менавіта ў малодшым школьным узросце.

А.С. Макаранка падкрэсліваў: «У дзіцячым узросце гульня – гэта норма, і дзіця павінна заўсёды гуляць, нават калі робіць сур'ёзную справу… Трэба напоўніць гульнёю ўсё яго жыццё» [1, с. 91–92].

Пазнаёміўшыся з сучаснымі адукацыйнымі тэхналогіямі, якія могуць выкарыстоўвацца з мэтай далучэння малодшых школьнікаў да чытання, мы вылучылі гульнявыя тэхналогіі. Гульня – звыклая і жаданая форма дзейнасці длямалодшага школьніка. Аб'яднаўшы гульню і вучэбна-адукацыйны працэс, гэтая тэхналогія дазваляе ажыццяўляць дыферэнцаваны падыход да вучняў, далучаць да працы ўсіх школьнікаў, улічваючы іх цікавасці, схільнасці і ўзровень падрыхтоўкі.

Практыкаванні гульнявога характару ўзбагачаюць вучняў пачатковых класаў новымі ўражаннямі, здымаюць стамляльнасць, дазваляюць палюбіць кнігу і працэс чытання. З мэтай далучэння малодшых школьнікаў да чытання на ўсіх этапах урока пажадана актыўна выкарыстоўваць розныя гульні, віктарыны, літаратурныя латарэі, інсцэніроўкі.

Традыцыйныя гульні, у аснове якіх ляжыць распазнаванне мастацкіх твораў па асобных малюнках, узнаўленне радкоў па зададзеных словах,

адгадванне герояў ці кніг па апісанні, адгадванне імён літаратурных герояў і інш., спрыяюць развіццю цікавасці вучняў пачатковых класаў да чытання.

Літаратурныя гульні – гэта гульні-спаборніцтвы, якія дапамагаюць высветліць, хто лепш і больш уважліва чытае кнігі. Яны прывучаюць малодшых школьнікаў да ўважлівага чытання кніг, дапамагаюць ім глыбей зразумець змест твора, звяртаюць увагу на мастацкія вартасці кнігі. Удзел у гульні, радасць распазнавання знаёмых кніг і іх герояў прыносіць вучням сапраўднае задавальненне.

Вучням пачатковых класаў вельмі падабаюцца віктарыны, так як яны дазваляюць ім адчуць дух спаборніцтва. Гэта віктарыны па творах пісьменнікаў, урок-віктарына «Казачная матэматыка», гульня-віктарына «Пазнайце героя казкі па апісанні і пазнаёмце з ім» (камандзе даецца цытата з казкі, дзе гаворыцца пра дзеянні героя; трэба ўспомніць любы іншы эпізод з яго ўдзелам і пазнаёміць з героем).

У гульні «Бюро знаходак» малодшым школьнікам  неабходна знайсці ўладальнікаў рэчаў, якія паступілі ў бюро знаходак (каса, пшанічны каласок, рэпа, сякера і інш.).

Гульня-падарожжа «Па старонках любімых кніг», літаратурны аўкцыён «Хто больш назаве?», конкурсы ўважлівых і начытаных «Чый гэта прадмет?», «Чый гэта колер?», «Ці ведаеце вы?», гульні-загадкі «Чые гэта словы?» «Чый гэта партрэт?», «Назаві аўтара» садзейнічаюць далучэнню малодшых школьнікаў да чытання, развіццю чытацкай цікавасці вучняў.

Можна ўключаць гульні як мадэлюючыя сітуацыі, напрыклад, «Ствараем класную бібліятэку», «Дзень нараджэння Кнігі». Карысны гульні са словамі, рытмамі і рыфмамі, гульні з нечаканымі асацыяцыямі. Можна ўключаць ва ўрок прыдумванне гісторый, якія вучні складаюць па аналогіі з якой-небудзь казкай. Напрыклад, складанне казкі «Вядро і лейка» па аналогіі з казкай «Журавель і чапля». Вучні з задавальненнем чытаюць класу складзеныя імі гісторыі.

Любяць малодшыя школьнікі такія творчыя праекты, як стварэнне зборнікаў любімых казак ці вершаў, крыжаванак, ілюстрацый да вывучаемых твораў і інш.

Але самай любімай гульнёй з’яўляецца гульня ў «сапраўдны спектакль», дзе адбываецца ролевае пераўвасабленне, фарміруецца адказнасць за агульную справу, з’яўляецца магчымасць даць кожнаму вучню працу па душы і па сілах. Дзеці вельмі любяць інсцэніраваць. Яны, як сапраўдныя акцёры, уваходзяць у вобразы герояў, і гэты ўзровень уваходжання – самы глыбокі, самы дзейсны ў выхаваўчым сэнсе. А каб сваю ролю сыграць, вучням трэба добра ведаць і асэнсаваць прачытаны тэкст. Самы зручны мастацка-славесны матэрыял для знаёмства дзяцей з інсцэніраваннем – фальклорная казка, прычым не чарадзейная, а бытавая, пра жывёл, ці кумулятыўная. Зручна пачынаць інсцэніраванне з кумулятыўных казак – гэта значыць з тых, у якіх дзеянне ад завязкі да развязкі  паўтараецца некалькі

разоў. Малодшым школьнікам лягчэй запомніць фабулу такой казкі: кожны эпізод паўтарае папярэдні, мяняецца толькі персанаж. Затым можна перайсці да інсцэніравання фальклорнай казкі, якая не патрабуе завучвання тэксту на памяць – можна гаварыць сваімі словамі, перадаючы сутнасць.

Значную ролю ў далучэнні малодшых школьнікаў да чытання адыгрываюць гутарка з бібліятэкарам, пошук кнігі на кніжных паліцах.

З выкарыстаннем мультымедыйных тэхналогій на аснове тэлевізійных гульняў «Зорная гадзіна», «Свая гульня», «Шчаслівы выпадак», «Што? Дзе? Калі?» можна ствараць гульні-ўрокі, якія садзейнічаюць развіццю пазнавальнай цікавасці, выхоўваюць цікавасць да кнігі, развіваюць мысленне вучняў.

Такім чынам, гульні даюць многае ў выхаванні культуры чытання, спрыяюць павышэнню цікавасці малодшых школьнікаў да кнігі, дапамагаюць вучням адкрываць новыя для іх кнігі. Мэта выкарыстання гульняў на уроках – выклікаць у школьнікаў устойлівую цікавасць да кнігі, прывіць ім першапачатковыя навыкі працы з кнігай.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Макаренко, А. С. Избранные педагогические сочинения. В 2-х т. Т. 1 / А. С. Макаренко. – М., 1977.